

# Добры дзень!



Дзеяслоў
Прыметнік
лік
зваротнасць
род
пераходнасць
асоба
трыванне
час
спражэнне
лад
стан
род
лік
склон
Дзеепрыметнік
трыванне
час
стан
род
лік
склон

* *Легенда-ўспамін*
* *“Наша сяло ўзведзенае раней за горад. Ад Луніна і Лунінец паходзіць. Сяло Лунін з даўніх часоў вялікае. Жыхароў тут заўсёды было «богато», а на месцы горада Лунінца нічога не было. Ніхто там не жыў. Толькі дзікія, непрыручаныя качкі плёскаліся ў астуджанай лужыне.*
* *Неяк адзін з жыхароў Луніна аддзяліўся ад сваякоў. Пасяліўся ён якраз там, дзе цяпер узняты горад. Пабудаваная хата, узараная зямля, пасаджаны сад, наладжаная гаспадарка… Неўзабаве яго*

| № п/п | дзеепрыметнік | азначальнае слова | прыметнік |
|---|---|---|---|
| 1 | узведзен-***АЕ*** | сяло | вялік-***АЕ*** |
| 2 | непрыручан-***ЫЯ*** | качкі | тлуст-***ЫЯ*** |
| 3 | астуджан-***АЙ*** | лужыне | брудн-***АЙ*** |
| 4 | узнят-***Ы*** | горад | сучасн-***Ы*** |
| 5 | пабудаван-***АЯ*** | хата | драўлян-***АЯ*** |
| 6 | узаран-***АЯ*** | зямля | цёпл-***АЯ*** |
| 7 | пасаджан-***Ы*** | сад | пладавіт-***Ы*** |
| 8 | наладжан-***АЯ*** | гаспадарка | нябедн-***АЯ*** |
| 9 | пераселен-***Ы*** | чалавек | прыгожы-***Ы*** |

# Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў

Нашы мэты:

1. **Пазнаёміцца …** са скланеннем дзеепры-метнікаў

2. **Фарміраваць …** ўменне правільна дапа-соўваць дзеепрыметнікі да азначальных слоў

3. **Выпрацоўваць …** навык правільнага на-пісання канчаткаў дзеепрыметнікаў

***“Абяднелая,***
***Апусцелая і змарнелая мая***
***Неўгамонная,***
***Непакорная,***
***Беларуская зямля!”.***

А.Дзеружынскі

# !!! Карысна ведаць !!!

НЕ ЎЖЫВАЮЦЦА

зваротныя дзеепрыметнікі на *-ся*

- *У розныя часы ў Лунінцы пабывала нямала праслаўлен… людзей. У большасці сваёй яны тут доўга не затрымліваліся, аднак імёны іх запісан… ў летапіс краю (пра гэта сведчаць мемарыяльныя шыльды і помнікі).*
- *Так, ў 1911 годзе ў Лунінец прыехаў саслан… Якуб Колас, хоць тады ён яшчэ быў проста Канстанцінам Міцкевічам. Пясняр толькі выйшаў з мінскага астрога, дзе адбываў пакаранне за ўдзел у падпольным настаўніцкім сходзе. У палескі гарадок ён прыехаў да аднакашніка, з якім вучыўся ў Нясвіжскай семінарыі. Было разлічан…, што зможа тут ўладкавацца на працу, але яму не пашанцавала. Колас перабіваўся прыватнымі ўрокамі,*

# Фізкультхвілінка






















Тратуар … … лісцем. Людзі, быццам … чалавечыя душы, шоргалі нагамі туды і назад. Было холадна і непрыемна. Унутры.

Словы для даведак:
**астуджаны, прысыпаны, пажоўклы**

*Вам гэта не трэба... Ды толькі праз што*
*Вы спінаю **грэеце**, цеплай крывёю?!.*
*Я проста Ваш вучань. І болей ніхто...*

*Вы словам вучылі і позіркам мудрым.*
*Ніхто **не сказаў**, што Вы голас ўзнялі!*
*Вы былі Матуляю, Сонечнай Пудрай,*
*Што нас **прыцiскала** да Роднай Зямлі...*

*Я **спаць** не магу, бо ўпэўненасць Веры*
*Ніхто мне не даў, а сваёй... Дык няма...*
*Заходжу ў клас... **Зачыняюцца** дзверы...*
*Тут дзеці. І думкі пустыя дарма...*

*Вы ёсць. Вы жывыя. Вы там... і са мною.*
*Вы збоку **жывеце** ўласным жыццём...*
*Ды толькі скажу я - сваёю душою*
*Мой вопыт зрабілі ўласным дзіцём.*

*Стаю на каленях, а Вы - нада мною...*
*Я "Дзякуй" кажу, бо сам здолець не змог*
*Таго, што мы з Вамі зліваем крывёю...*

# Дамашняе заданне:

**§6, практ. 53,**
**практ. 52**
**(вуснае выказванне) –**
**дадаткова па жаданню**

# Вялікі дзякуй!